Філіпаў М.

# ФРАНТАВАЯ АРЫФМЕТЫКА

Беларус Генадзь Вялічка са Шклоўскага раёна і валжанін Іван Дзегцяроў пасябравалі ў Саратаве ў запасным палку. З вялікай стараннасцю вывучалі сябры стралковую справу, не раз вызначаліся майстэрствам валодання зброяй. І таму не было нічога дзіўнага, калі яны, трапіўшы ў 278-ю стралковую дывізію, былі залічаны ў адзін кулямётны разлік. Вялічка – першым нумарам і камандзірам, а Дзегцяроў – другім.

...Гітлераўцы наступалі па правабярэжжу Дона, спрабуючы перабрацца на левы бок ракі каля станіц Казанскай і Вешанскай. Камандзір роты старшы лейтэнант Шац загадаў Вялічку атрымаць у старшыні новенькі "максім" і, прыхапіўшы пабольш патронаў, заняць толькі што пабудаваны сапёрамі дзот.

– Пакуль немцаў няма, прыстраляйце кулямёт. Калі што здарыцца, не падумайце, што адны на белым свеце – дапаможам. – І коратка растлумачыў: – Задача ваша простая: трымаць дзот да апошняга. Ён мае вялікае значэнне ў нашай абароне.

З амбразуры дзота добра віднелася шырока раскінутае поле няўбранай пшаніцы, а за ім, кіламетрах у двух – нібы востраў, цёмны лес. Гаворачы аб ім, старшы лейтэнант папярэдзіў: "Не спускаць вачэй!".

...У ліпеньскім стэпе ўсю ноч трымалася такая цішыня, што, здавалася. нібы і не было на зямлі вайны. Аднак сэрца Генадзя Вялічкі білася неспакойна. "Відаць жа недарэмна, – думаў ён, – учора над поймай Дона круціўся фашысцкі самалёт, выглядаючы пераправы". І прадчуванне не падвяло. На золку цішыня раптам абарвалася, і на пярэдні край абароны роты пасыпаліся снарады. Закруціліся ў паветры, нібы вялізныя птушкі, густыя клубы дыму. Здавалася выла, пішчала, стагнала само неба.

Колькі часу бушавала гэтае страшэннае пекла, ні Вялічка, ні Дзегцяроў сказаць не маглі. Запомнілася толькі: немцы спынілі артылерыйскую малацьбу па нашай перадавой такжа раптоўна, як і абрушылі на яе шквал агню.

Пасля кароткага перапынку праціўнік перанёс агонь на суседні ўчастак – ніжэй па Дону, да пераправы. Дым над полем рассеяўся, пыл асеў,і толькі было Генадзь падумаў, што бяда, магчыма, мінавала, як пачуў голас Дзегцярова:

– Танкі!..

Чорныя, вуглаватыя машыны, якія паказаліся з-за лесу, накіраваліся ў бок пераправы, куды цяпер ляцелі фашысцкія снарады. Нашы батарэйцы паспелі даць па іх некалькі залпаў, але ўрону прынесці ворагу не змаглі.

Мінут праз некалькі Дзегцяроў зноў паведаміў:

– Аўтаматчыкі!

Выйшаўшы з лесу, гітлераўцы расцягнуліся ланцугом і правым сваім флангам заварочвалі да акопаў стралковай роты Шаца. Падобна было, што немцы не думалі натыкнуцца тут на сур’ёзнае супраціўленне – абарона ж рускіх толькі што падвяргалася моцнай артылерыйскай апрацоўцы.

– Што ж, сустрэнем, як належыць, – скрозь зубы працадзіў Вялічка.

– Дай я. У мяне рука лёгкая, – папрасіў Дзегцяроў.

– Ну. што ж, пачынай, – згадзіўся Вялічка. – Толькі падпусці бліжэй...

Кулямёт "загаварыў", калі варожыя аўтаматчыкі выйшлі з пшанічнага поля і да дзота ім заставалася менш як 200 метраў. Фашысты залеглі. Адны па-пластунску перапаўзалі ад аднаго ўкрыцця да другога, другія круціліся на месцы, не спяшаючыся насустрач смерці.

У другім ланцугу аказаліся мінамётчыкі. Заняўшы агнявую пазіцыю, яны павялі абстрэл дзота, але малакаліберныя міны не маглі нанесці яму сур’ёзнай шкоды.

Дзегцяроў страляў амаль не перастаючы. Гітлераўцы, не змогшы наблізіцца да дзота або абысці яго, затаіліся, шчыльна прыціснуліся да зямлі.

Выкарыстаў’шы паўзу, Вялічка крыкнуў сябру:

– Адпачні!.. Дай я стану да "максіма".

Уступіўшы камандзіру кулямёт. Дзегцяроў прыняўся набіваць патронамі чарговую стужку. Яны спадзяваліся, што камандзір роты прышле на дапамогу людзей, але паявіўся толькі сувязны. Ён прыцягнуў скрыню патронаў, паўканістры вады і перадаў загад: "Трымацца".

Калі сувязны пайшоў, варожыя аўтаматчыкі ўзняліся ў новую атаку. Хваляй хлынулі яны на акопы. Вялічка не спяшаўся страляць, і Дзегцярову здалося, што адмовіў "максім". А гітлераўцы, напэўна, падумаўшы, што кулямётчыкі пакінулі дзот, пайшлі смялей. У гэтую мінуту Генадзь націснуў пальцамі гашэтку. Доўгая чарга падкасіла з дзесятак аўтаматчыкаў. Другая вырубіла з набліжаўшайся аравы яшчэ столькі. Вялічка хлястаў па тых, хто бег, нібы стальным бізуном. Зараз для яго не існавала нічога на свеце, акрамя пякучай нянавісці да ворага. Ён помсціў фашыстам за спаленыя гарады і сёлы, за загінуўшага брата Уладзіміра, за гора і слёзы маці Лукер’і Цімафееўны, за пакуты многіх савецкіх людзей...

Кулямёт калаціўся, як у азнобе. Ад напружання трасло і самаго Генадзя... Раскаліўся ствол кулямёта, дымілася побач куча гільз.

Свінцовы лівень, нарэшце, прымусіў нямецкіх аўтаматчыкаў адступіць.

Генадзь абарваў стральбу, каб перадыхнуць.

– З гармат бы па гадах! – пачарнелы ад копаці ў душным, загазаваным дзоце, Дзегцяроў ледзь выгаварыў гэта. І, нібы пачуўшы

яго пажаданне, батарэйцы адкрылі агонь з гармат і так удала, што можна было іх стральбу не карэкціраваць.

У сяброў-кулямётчыкаў заблішчалі вочы. Гавораць, што шчасце – гэта тое, што чалавек атрымлівае звыш чакання. Іменна такое шчасце адчулі ў той момант двое сяброў-таварышаў. Выбраўшыся з дзота, яны не пазналі навакольнай мясцовасці. Зраненая, з мноствам варонак ад снарадаў, зямля дыхала рэшткамі чаду і гары, а злева ад дзота, гэтай маленькай крэпасці, ляжалі вывернутыя з карэннямі бярозкі.

Калі гітлераўцы, адкаціўшыся, схаваліся ў лесе, да кулямётчыкаў прыйшоў камандзір роты. Разумеючы, якую напружаную схватку з ворагам яны вытрымалі, запытаў сардэчна, па-бацькоўску:

– Ну, дакладвайце, сынкі: чым тут займаліся?

Хударлявы, сярэдняга росту юнак беларус і моцны валжанін пераглянуліся, маўляў, аб чым дакладваць, усё і так зразумела. Але знайшоўшы ў сабе сілы ўсміхнуцца, Вялічка ўсё ж сказаў:

– Выконвалі простую задачу, таварыш старшы лейтэнант. Займаліся арыфметыкай. – І ён паказаў на поле перад дзотам.

Тое, што адкрылася вачам ротнага, здзівіла. Ён моўчкі і горача абняў аднаго, другога...

– Героі вы нашы! – і, кіўнуўшы галавой у бок перабітых гітлераўцаў, сказаў: – Вечарам "трафеі" вашы падлічым. А пакуль той жа загад: трымацца!

...Завечарэла. Тыя байцы, што з'явіліся на чале са старшым лейтэнантам, сабралі зброю гітлераўцаў і іх дакументы. Падлічылі колькасць забітых. Шац, які ваяваў з першых дзён нападу гітлераўцаў на нашу зямлю і бачыў на фронце ўсялякае, паўтараў з захапленнем:

– Вось гэта арыфметыка!.. Для фашыстаў вылічэнне, для нас складанне: 68 на рахунку Дзегцярова, плюс 115 крыжыкаў на рахунку Вялічкі. Усяго 183... Навука – што трэба!

Як склаўся лёс баявога сябра Вялічкі, рускага хлопца Івана Дзегцярова, невядома, а Генадзь Іосіфавіч Вялічка, які ўдзельнічаў у баях на Доне, Паўночным Данцы і Прыдняпроўі і знішчыў за ўвесь гэты час 378 гітлераўцаў, быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Залатую Зорку і ордэн Леніна яму ўручыў камандаваўшы тады 3-й гвардзейскай арміяй Д. Д. Лелюшэнка, цяпер двойчы Герой Савецкага Саюза, генерал арміі, з якім Генадзь Іосіфавіч не раз сустракаўся пасля перамогі над фашысцкай Германіяй.

**Філіпаў, М. Франтавая арыфметыка / М. Філіпаў // Магілёўская праўда. — 1982. — 24 лютага. — С. 4.**